лялася вельмі мала ўвагі.

У шэрагу педагагічных даследванняў паказана значнае павышэнне у навучэнцаў розумавай актыўнасці, колькасці арыгінальных асацыяцый, пасіленне матывацыі пры уводзінах у навучальны працэс для старшакласнікаў дысцыплін мастацка-творчага цыклу. Навучэнцы у класах з пасіленным праходжаннем дысцыплін мастацка-эстэтычнага цыклу значна перавышалі сваіх аднагодкаў з матэматычным ухілам навучання, а тым больш вучняў, займаючыхся па звычайнай праграме, па большасці параметраў, характарызуючых прадуктыўнасць і дынамічнасць мыслення.

У шэрагу даследванняў выяўлена магчымасць змянення рознымі відамі мастацка творчай дзейнасці супрацьпраўных установак ў падлеткаў з асацыяльнай накіраванасцю паводзін.

Вывучэнне намі на працягу шэрагу гадоў уплыву музыкальна-харэаграфічнай дзейнасці на разнастайныя псіхічныя функцыі дзяцей рознага узросту выявіла, што у працэсе заняткаў у дзяцей актыўна развіваюцца псіхаматорныя функцыі, уласцівасці увагі, тэмп рэакцый, кінастэзічная пачуццёвасць, самарэгуляцыя, здольнасць адэкватнага успрымання і ацэньвання часу.

У разглядаемым кірунку выключна вялікія развіваючыя магчымасці тэатральнай творчасці асобы і асабліва у фарміраванні камунікатыўных уменняў і культуры мовы, невербальных форм паводзін, самарэгуляцыі паміжасобавых адносін, самапазнання.

## ЦЭННАСНЫЯ АДНОСІНЫ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ ДА ВЫБРАНАЙ ПРАФЕСІІ

А.Б.Каганаў

Праблема вывучэння цэнасных адносін студэнтаў да выбранай прафесіі мае важнае тэарэтычнае і практычнае значэнне. Цэнасныя адносіны да прафесіі з'яўляюцца значным элементам у структуры уведамлення асобы, робячым уплыў на інтэлектуальную і эмацыянальна-валявую актыўнасць, у прыватнасці, на паспяховасць вучэбнай дзейнасці.

Намі было праведзена эксперыментальнае даследванне цэннас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных адносін будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў да выбранай прафесіі. Аб'ект даследвання – студэнты другога курса ФББ МІК. Была выкарыстана методыка апытання Розэнберга-Тітмы, мадыфікаваная намі для вуснага апытання. Гэта методыка паспяхова выкарыстоўвалась намі у 1982-1988 гадах. Усяго у снежні 1992 года было апытана 105 чалавек. Студэнты ацэнівалі грамацкую (прэстыж) і асабістую (прывабнасць) цэннасць бібліятачнай і шэрага другіх прафесій. Шкала ацэнівання мела працягласць 3 бала – ад I (ніжэйшая) да 4-х (вышэйшая). Упершыню у спіс былі унесены "новыя" прафесіі – фермер, мэнэджэр, прадпрымальнік.

Былі атрыманы наступныя вынікі.

Найбольш прэстыжнымі апынуліся прафесіі мэнэджэра (3,73), прадпрымальніка (3,66), урача (3,57), юрыста (3,57). Дастаткова прэстыжнымі – эканаміста (3,37), прадаўца (3,18), фермера (3,06), бухгалтара (2,87), педагога (2,83).

Непрэстыжнымі – культасветработніка (I,57), палявода (I,68), механізатара (I,8I), бібліятэкара (I,87).

Упершыню за ўсе гады даследвання у спісе з'явіліся прафесіі больш прэстыжныя, чым урач і юрыст. Гэта – модныя прафесіі мэнэджэра і прадпрымальніка. Рэзка падскочыў прэстыж бухгалтара.

Гэта – натуральнае следства унядрэння рыначнай эканомікі. Па-ранейшаму непрэстыжныя прафесіі, па якім традыцыйна рыхтуюць спецыялістаў у нашым інстытуце, хаця сур'езныя станоўчыя зрухі ў іх характары і зместу з'явіліся, што адлюстравалася ў наменклатуры (у прыватнасці, з'явіліся спецыяльнасці "мэнэджэр культасветработы", сацыяльны педагог і іншыя).

Што датычыцца будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў, то яны як высвятлілася, свядома ідуць вучыцца не на модныя прафесіі.

Чым жа яны кіруюцца у сваім выбары?

Часткова адказ на гэтае пытанне даюць вынікі ацэнкі студэнтамі прывабнасці прафесій.

Найбольш прывабнымі яны лічаць прафесіі бібліятэкара (3,13) юрыста (3,10), філолага (3,06). Дастаткова прывабнымі – урача (2,73), педагога (2,7), мэнэджэра (2,6), культасветработніка (2,5I), прадпрымальніка (2,5), эканаміста (2,4).

Непрывабныя з пункту гледжання студэнтаў наступныя прафесіі: механізатара (I,3), палявода (I,5), агранома (I,7), фізі-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ка (I,73), матэматыка (I,74).

У цэлым у даследваных намі студэнтаў факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі можна адзначыць яўна выяўленую гуманітарную накіраванасць. Яна яўна пераважае сялянскую, матэматычную, прагматычную.

Такая накіраванасць сведчыць аб тым, што, не гледзячы на нізкі прэстыж бібліятэчнай прафесіі, яе набыцце з'ўляецца для студэнтаў безумоўнай каштоўнасцю, таму што стварае добрыя падставы для актыўнага, заінтэрэсаванага удзелу будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў у вучэбным працэсе.

## БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ І ІХ МЕСЦА У РАЗВІЦЦІ МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ АСОБЫ

Л.М.Рогачова

Накапленне гістарычных ведаў аб сваім народзе, вывучэнне яго традыцый, асэнсаванне этнічнай спецыфікі ў галіне фальклору, народнага мастацтва, звычаяў і абрадаў аказваюць непасрэднае ўздзеянне на нацыянальную самасвядомасць народа, садзейнічаюць захаванню яго нацыянальнай самабытнасці.

Асаблівую актуальнасць гэтая праблема набыла сення, калі на першы план грамадскага і палітычнага развіцця рэспублікі вылучаюцца пытанні культурнага адраджэння беларускага народа, паўстае неабходнасць распрацоўкі новае канцэпцыі выхавання падрастаючага пакалення.

Пануючыя ў папярэдні дзесяцігоддзі стэрэатыпы у арганізацыі сістэмы выхавання разглядалі працэс выхавання асобы праз прызму палітыка-ідэалагічных структур. Гэткая практыка прывяла да нівеліравання асабістых характарыстык чалавека у маштабе былога Саюза, падаўленню нацыянальнай самабытнасці выхаваўчай сістэмы беларускага народу, да забыцця і страты яе нацыянальных рыс.

Пераадоленне гэтых негатыўных з'яў шчыльна звязана з далучэннем моладзі да багацейшай спадчыны нацыянальнай культуры, якая стваралася на працягу шматстагоддзяў і увайшла у скарбон-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ